# З дыялектыкі чысла

Усякае **чысло** можа быць: 1) сумаю, 2) розьніцаю, 3) здабыткам, 4) дзельлю, 5) складнікам, 6) аднім[аным], 7) множнікам, 8) множыв[ам], 9) коранем, 10) ступеньню, 11) коэфіцыэнт[ам], 12) процэнтам, 13) інтэгр[алам], 14) дыф[эрэнцыялам], 15) можа быць адмоўным *(3–)* і 16) станоўчым *(3+)* і г. д., 17) пака[зьнікам] і 18) лічнікам. Яно нішто і яно ўсё. Яно можа быць і пудам, і мэтрам, і літрам, і г. д. Узятае само па сабе яно нішто, яно абстракцыя. Нечым–жа, г. ё. значным, яно становіцца ў процэсе разьвіцьця дзейнасьці, у процэсе гэтай дзейнасьці, у яе руху. Значным яно становіцца ў процэсе рэальных дачыненьняў дзейнасьці, у процэсе дачыненьняў рэчаў, у процэсе рэчадачыненьняў. Яны значны ў зьявах дзейнасьці. Узятае–ж для сябе чысло ёсьць усё, яно **можа** быць усім, яно заключае ў сабе магчымасьці ўсяго, заключае магчымасьці быць для сябе ўсім.

---

2 ёсьць 2 і ў той–жа момант і ня 2, а прыкладам, 1 + 1 або 7 — 5 або –3 + 5 і гэтак бясконца. Прыклад адрознасьці ў тойсамасьці.

---

Матэматыка як навука аб колькасных дачыненьнях або проста аб колькасьці і яе выражэньні.

---

Кожны лік (чысло) ёсьць колькаснае выражэньне дачыненьня. Калі мы гаворым 1, або 2, або 3, — гэта значыць, што наяўнасьць данага так дачыняецца да прынятага намі за адзінку як адна, дзьве або тры такіх адзінкі.

---

Калі мы лічым, што мы вымяраем яго колькасьць — г. зн. ставім яго ў дачыненьне да меры.

---

Адніманьне, складаньне ёсьць простыя мэханічныя процэсы. Множаньне і дзяленьне ёсьць тыя–ж процэсы, [больш] склад[аныя]. Узводжаньне ў ступень, вылуч[эньне] кораня, інтэграц[ыя] і дыфэрэнц[ыяцыя] — усё гэта процэсы, праз якія колькасьць пераходзіць у якасьць.

---

3 — 1 ёсьць выражэньне розьніцы ў колькасьці +3 і –1 (станоўчага трох і адмоўнага аднаго). Гэта розьніца ў данным выпадку між тым, калі ёсьць тры і бракуе аднаго, то гэта розьніца роўна 2 **станоўчым**.

*[1931 — 1932]*